# Людзі дапытлівай думкі

САЛІГОРСКАЯ прамысловая абагачальная фабрыка ўступіла ў строй нядаўна. Яна з сільвініту выдаляе адходы і шляхам флатацыі ачышчае ад прымясей калійную соль. Калектыў тут працуе малады, таленавіты, дапытлівы. Аб гэтым яскрава гаворыць ужо адзін той факт, што тут растуць рады рацыяналізатараў.

Вось доказ гэтаму. З дня выдачы першага канцэнтрата ўнесена рацыяналізатарскіх прапаноў столькі, што ўкараненне іх у вытворчасць дало магчымасць сэканоміць за шэсць месяцаў 98 тысяч рублёў.

Асаблівую актыўнасць праяўляюць рацыяналізатары механік Аляксандр Лебедзь, слесар Міхаіл Клішэвіч, начальнік змены Генадзь Міхайлавіч Салаўёў, электрамеханік Барыс Дзімітраў і многія іншыя. Кожны пяты на фабрыцы — рацыяналізатар.

Р. ВАСІЛЬЕЎ.